# АПОВЕСЦЬ ПАЎЛА МІСЬКО «ЭРПІДЫ НА ПЛАНЕЦЕ ЗЯМЛЯ» ЯК УЗОР ФАНТАСТЫЧНАГА ЖАНРУ

***І. І. Пятроўская***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца адметнасць фантастычнага жанру на матэрыяле аповесці Паўла Місько «Эрпіды на планеце Зямля», даследуецца праблемна-тэматычнае і вобразнае наватарства пісьменніка.

**Ключавыя словы:** фантастыка; прыгоды; падарожжы; літаратура для юнакоў і падлеткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існуе меркаванне: усё, што чалавек здольны ўявіць, рэальна існуе. Адным з самых любімых жанраў у літаратуры застаецца фантастыка. Фантастычныя творы займаюць значнае месца ў літаратуры. Менавіта яны дапамагаюць развіваць фантазію чытача. Адметным прыкладам фантастычнай казкі з'яўляецца казка П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля», у аснову якой пакладзена фантастычная гісторыя, што адбылася са звычайнымі хлопчыкамі, якія сустрэлі эрпідаў (электронных робатаў-паліглотаў ізаляванага дзеяння), што прыляцелі на Зямлю з пэўнай місіяй – даследаваць жыццё на нашай планеце, а ў прыватнасці, на Беларусі.

Эрпіды ў творы – вельмі разумныя робаты. У сваёй мове яны выкарыстоўваюць навуковыя тэрміны: «*У паветры зменшылася колькасць двухвокісу серы і сернага ангідрыду. Яны растварыліся ў вадзе, у дажджы. У зямлю прасочваюцца шкодныя кіслоты*» [1]. Яны ведаюць шмат моў, а таксама здольны перакладаць мову звяроў на чалавечую. У эрпідаў ёсць яшчэ адна асаблівасць – яны чытаюць думкі людзей: «*У Эрпіда папытаў бы, што ў нас у галаве робіцца. Ён жа нашы думкі чытае і бачыць!.. І твае таксама!*» [1]. Аўтар з дапамогай гэтых незвычайных істот расказвае пра нашу планету, пра людзей, якія тут жывуць, а таксама пра жывёльны і раслінны свет.

Фантастычныя творы заўсёды клапоцяцца пра будучыню чалавецтва. Аўтар закранае вельмі важную праблему – праблему экалогіі праз апісанне ўзаемадзеяння паміж эрпідам і чалавекам. Цікава,што Эрпід паўстае больш чалавечным, чым сам чалавек. Казка прасякнута пачуццём адказнасці за тое, што адбываецца ў свеце, у прыродзе.

Чалавецтва хвалюе яшчэ адно пытанне, якое аўтар закранае ў творы: ці змогуць чалавека замяніць робаты? П. Міська лічыць, што робаты не здольны замяніць чалавека. На думку вядучага спецыяліста ў галіне робатаў, ужо сёння мы можам бачыць прыклады таго, як людзі паводзяць сябе нібы машыны, у той час, як робаты становяцца ўсё больш чалавечнымі.

Такім чынам, усё вышэйсказанае сведчыць аб тым, што казка «Эрпіды на планеце Зямля» аказвае вялікае ўздзеянне на чытача. Па-першае, казка мае пазнавальнае значэнне: чытач знаёміцца з насельнікамі жывёльнага і расліннага свету, з іншаземнымі істотамі, у аснове твора ляжыць гіпотэза аб існаванні іншаземных цывілізацый. Па-другое, казка мае выхаваўчае значэнне: пісьменнік вучыць ахоўваць і берагчы прыроду. Па-трэцяе, казка развівае ўяўленне і мысленне юных чытачоў. Можна сказаць, што казка П. Міська «Эрпіды на планеце Зямля» – гэта адзін з лепшых узораў фантастычнай казкі ў беларускай літаратуры. Тут фантастыка спалучаецца з рэальнасцю, прыведзены некаторыя гіпотэзы аб існаванні іншаземных цывілізацый, закрануты актуальныя праблемы нашага сучаснага грамадства. Гэта аповесць дорыць нам не толькі пэўныя веды з розных сфер навукі, але і вучыць быць сапраўднымі прыстойнымі людзьмі.

## *Літаратура*

1. Міська, П. Эрпіды на планеце Зямля [Электронны рэсурс] / П. Міська. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Paval_Misko/ Erpidy_na_planiecie_Ziamla.html. – Дата доступу: 16.04.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ